# ЭКСПЕРТЫ ВЫЗНАЧЫЛІ СУІСКАЛЬНІКАЎ

Фота Алены Дзядзюлі



Выніковае пасяджэнне Экспертнага савета па прэміях Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва за 2023-2024 гады пры падтрымцы Пастаяннага Камітэта прайшло ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Падчас яго былі падведзены вынікі грамадскага абмеркавання праектаў, адабраных для ўдзелу ў конкурсе на суісканне прэмій.

Прэміі Саюзнай дзяржавы прысуджаюцца за творы літаратуры і мастацтва, якія спрыяюць умацаванню сяброўскіх, братэрскіх адносін, усебаковаму супрацоўніцтву паміж краінамі-ўдзельніцамі Саюзнай дзяржавы. Такія ўзнагароды ўручаюцца раз у два гады. Экспертны савет па прэміях пры Пастаянным Камітэце Саюзнай дзяржавы створаны з ліку вядомых дзеячоў літаратуры і мастацтва, прадстаўнікоў творчых саюзаў, дзяржустаноў і арганізацый Беларусі і Расіі.

“Праект Саюзнай дзяржавы ўнікальны, ён паказвае сваю жыццядзейнасць і эфектыўнасць. Узаемадзеянне здзяйсняецца па розных кірунках, безумоўна, і ў галіне культуры. Прэмія Саюзнай дзяржавы – пацвярджэнне гэтаму супрацоўніцтву”, адзначыў першы намеснік міністра культуры Беларусі, сустаршыня Экспертнага савета Валерый Грамада. Перад пачаткам таемнага галасавання, на якім абіраліся лаўрэаты, ён заўважыў, што ўсе праекты, прадстаўленыя на суісканне прэміі, заслугоўваюць увагі.

У ліку трох прэтэндэнтаў, вызначаных Экспертным саветам з беларускага боку, — аўтарскі калектыў, які працаваў над стварэннем музея ў Дзяржаўным мемарыяльным комплексе «Хатынь» (архітэктар Віктар Скробат, мастак-манументаліст Андрэй Пяткевіч, дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь Аляксандр Храмы). Таксама на ганаровае званне прэтэндуюць галоўны дырэктар Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларускай дзяржаўнай філармоніі Аляксандр Анісімаў, які стварыў цыкл канцэртаў, прысвечаных Перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, і член Саюза пісьменнікаў Беларусі, вядомы даследчык і калекцыянер Уладзімір Ліхадзедаў за стварэнне і рэалізацыю гісторыка-асветніцкага праекта «Бацькаўшчына» і выданне аўтарскіх кніг-альбомаў.